якая выпрацоўвае сукупнасць мэт, каштоўнасцяў і арыенціраў, да якіх могуць апеляваць індывіды і якія прыдаюць ім сэнс жыцця. Яна датэрмінуе светапогляд, перакананні, установкі свядомасці і рэгулятывы паводзін асобы. Менавіта таму важна наяўнасць дзяржаўнай ідэалогіі, якая дазваляе аптымізаваць працэс фарміравання палітычнай культуры маладога пакалення.

Зараз моладзь арыентуецца на актыўны і дзейсны ўдзел у рэфармаванні грамадства. Ажыццяўленне гэтай задачы ў значнай ступені залежыць ад стварэння ў краіне эфектыўнай і аптымальнай сістэмы фарміравання яе палітычнай культуры.


### Літаратура

1. *Местовский Н. А.* Состояние политической культуры студенческой молодежи в современном трансформирующемся обществе // Социология. 2000. № 2.
2. *Бабосов Е.* Молодежь Беларуси на пороге XXI века // Беларуская думка. 1999. № 6.
3. *Назаренко Л. Е., Маслова И. И.* О жизненных ориентациях современной молодежи // Экономика и право переходного периода: Материалы IV Междунар. конф. Гродно, 2000.



### Summary

*Transformation processes in modern Belarus society and problems of political youth culture. Main social and economical, political and psychological factors which influence the process of political youth culture formation under the conditions of belarussian society systematical transformation are analyzed. Some ways and means of this process optimization to formate political youth culture are underlined.*


УДК 316.346.32-053.6(476)

*Э. Р. Іофе*

## Да пытання аб павышэнні сацыяльнага статусу моладзі Беларусі на сучасным этапе

Тэрмін «сацыяльны статус» у нашы дні мае дваякі сэнс. Папершае, гэта суадносная пазіцыя індывіда або сацыяльнай групы, якая вызначаецца сацыяльнымі прыкметамі (эканамічнае становішча, прафесія, кваліфікацыя, адукацыя і да т. п.), прыроднымі прыкметамі (пол, узрост і г. д.), а таксама прэстыжам і месцам у структуры ўлады. Па-другое, гэта сукупнасць правоў і абавязкаў індывіда або сацыяльнай групы, якая звязана з выкананнем імі пэўнай сацыяльнай ролі.

У вузкім сэнсе слова сацыяльны статус — гэта становішча чалавека, якое ён аўтаматычна займае як прадстаўнік вялікай сацыяльнай групы (прафесійнай, узроставай, класавай, нацыянальнай). М. Вебер адзначаў, што сацыяльны статус — інтэграваны паказчык становішча індывіда або сацыяльнай групы ў грамадстве, якое разглядаецца як сістэма.

Для вучоных-сацыёлагаў нашай краіны інтарэс уяўляе аналіз сацыяльнага статусу моладзі Беларусі і фактараў яго павышэння на сучасным этапе развіцця беларускага грамадства.

Па выніках рэспубліканскага перапісу насельніцтва 1999 г., моладзь ва ўзросце 15—29 гадоў налічвае 21,9 % усяго насельніцтва Беларусі [1].

Наша грамадства яшчэ знаходзіцца ў стане эканамічнага і духоўнага крызісу, зніжэння жыццёвага ўзроўню шмат насельніцтва рэспублікі. Аналіз сацыяльнага статусу моладзі Беларусі паказвае, што найбольш ушчэмленая эканамічна і бяспраўная ў сацыяльна-прававым становішчы тая частка маладых людзей, якая жыве ва ўмовах павышанай сацыяльнай напружанасці і псіхалагічнага дыскамфорту. Рост колькасці самазабойстваў, распаўсюджанасць у маладзёжным асяроддзі наркаманіі, прастытуцыі, п'янства, дзедаўшчыны ў арміі — сведчанне павышанай сацыяльнай напружанасці.

Корань бедстваў моладзі, магчыма, ў адсутнасці пэўных ідэалаў, духоўных каштоўнасцяў, маральных арыенціраў, на якія яна магла б абапірацца. Песімізм, упадніцтва, распаўсюджаныя ў асяроддзі дарослых, уплываюць на моладзь.

Жыццё стала больш жорсткім, трывожным, яно прынесла свае трагедыі і «правілы гульні». Калі дзесяць год назад тэма грошай, прадпрымальніцтва, прыватнага бізнесу і да т. п. была «неактуальнай» для школьнікаў і многіх студэнтаў, то цяпер мы гаворым аб існаванні «маладзёжнай эканомікі». Калі раней маладыя людзі больш арыентаваліся на трату грошай, то цяпер усё больш просьбаў аб дзяржаўных субсідыях і льготах, павелічэнні студэнцкіх стыпендый, стварэнні рабочых месц для моладзі.

Ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу сучаснай Беларусі ў выключна складанай сітуацыі аказаліся многія юнакі і дзяўчаты. Неабходнасць плаціць за атрыманне адукацыі, рост беспрацоўя, абыякавыя адносіны ўрада да жыццёвых клопатаў падрастаючага пакалення прыводзяць да «запраграміраванага дрэннага становішча моладзі».

На пытанне аб сваім матэрыяльным становішчы ні адзін з апрошаных студэнтаў Акадэміі фізічнага выхавання і спорту Рэспублікі Беларусь не лічыць сябе багатым, 42 % перакананы, што яны людзі з сярэднім дастаткам, 47 % — бедныя, 5 % — жабракі, астатнія не пажадалі адказаць [2].

На падобныя пытанні 12 % студэнтаў БДПУ ў час праведзенага намі сацыялагічнага даследавання ў 2001 г. адказалі, што іх забяспечанасць вышэй сярэдняга, 80 % перакананы, што яны людзі з сярэднім дастаткам, 8 % — бедныя.

Практычна кожны другі студэнт (у гэту катэгорыю пападаюць менавіта «бедныя студэнты») шукае сабе работу. Зрабіць гэта нялёгка, паколькі жадаючых шмат, і маладыя людзі бяруцца за любую работу, у тым ліку і за ўборку памяшканняў.

Сярод звярнуўшыхся ў 2000 г. за садзеяннем у працаўладкаванні 211,8 тысяч жыхароў Беларусі 51,8 % склалі маладыя людзі ва ўзросце 16—29 гадоў. У якасці беспрацоўных за гэты перыяд было зарэгістравана 109,7 тысяч маладых людзей [3].

У наш час уменне «скалаціць» маёмасць, багацце разглядаецца ў якасці асноўнай меркі чалавечай годнасці. Ужо даўно не пытаюць аб тым, дзе людзі набываюць грошы. Дыферэнцыяцыя моладзі, якая развіваецца з кожным годам, размяркоўвае падрастаючае пакаленне ў розныя грамадскія сферы, якія здольны прынесці нейкі прыбытак. Думкі аб тым, што каштоўнасць чалавека вызначаецца карыснасцю яго працы для грамадства, прытрымлівалася 35 % студэнтаў, а 44 % бачылі сэнс жыцця ў самарэалізацыі і дасягненні поспеху [4], прычым рознымі шляхамі.

У наяўнасці яўны кампраміс паміж інтарэсамі моладзі і рэальнымі магчымасцямі сацыяльнай мабільнасці. У параўнанні з 1991 г. удзельная вага тых, хто адрозніваўся высокім узроўнем сацыяльнага статусу, скараціўся ў канцы 2000 г. амаль у два разы. У столькі ж разоў узрасла доля нізкастатусных груп моладзі.

Маладыя людзі, якім «пашанцавала» ў жыцці, ствараюць хоць невялікую, але сапраўды квітнеючую групу. Гэта, як правіла, тыя, хто атрымаў у спадчыну становішча эліты, якая плаўна перайшла ў разрад новага кіраўніцтва, банкіраў і бізнесменаў. Яны складаюць каля 60 % «новых беларусаў». Асноўнай жа частцы моладзі нарыхтаваны другарадныя ролі і некваліфікаваная праца ў інфраструктуры бізнесу. Не жадаючы працаваць на дзяржаўных прадпрыемствах і не здолеўшы заняць высокае становішча, большасць з іх вымушана пайсці па шляху крымінальнай дзейнасці.

Прыкладна 57 % апытаных меркавалі, што фактарам жыццёвага поспеху з'яўляецца добрая адукацыя, і 53 % сцвярджалі, што важным выступае і прадпрымальніцтва [5].

На аснове сацыялагічных даследаванняў, праведзеных сярод студэнтаў БДПУ і Міжнароднага гуманітарнага інстытута БДУ ў 2000—2001 гг., можна зрабіць выснову, што ў цэлым пераважае прагматычны падыход моладзі да будучай працы. Так, большасць апытаных лічыць, што хоць і важны грамадска карысны, творчы сэнс працоўнай дзейнасці, але нельга забываць і аб зароб-

ку. Для кожнага дзевятага жадаемай з'яўляецца любая добра аплачваемая работа, для кожнага пятага яна будзе мець жыццёвы інтарэс, калі дасць магчымасць рэалізаваць у першую чаргу яго асабістыя планы. У пошуках працы кожны другі студэнт схільны спадзявацца ў асноўным на сябе. У гэтай сувязі для ўмацавання і павышэння свайго сацыяльнага статусу ў сучасным беларускім грамадстве, а таксама магчымага жыцця ў іншых краінах, для большай упэўненасці студэнты імкнуцца атрымаць вышэйшую адукацыю (больш за 60 %), вывучыць замежныя мовы (каля 35 %), навучыцца працаваць на камп'ютэры і ў інтэрнеце (31 %), набыць навыкі вядзення бізнесу, уменне правільна мысліць і дзейнічаць ва ўмовах рыначнай эканомікі (28,5 %), атрымаць прававую падрыхтоўку (11,3 %).

Сёння адукацыя стала фактарам умацавання сацыяльнай няроўнасці. Дзецям «маючых уладу» і багатых людзей ствараецца магчымасць папасці ў вузкую групу, якая ў будучым атрымае доступ да рычагоў улады ў эканоміцы і палітыцы.

У той жа час значная частка моладзі Беларусі вельмі сур'ёзна задумваецца аб сваім сацыяльным статусе і месцы ў грамадстве, пачынае ясна ўсведамляць, што вырашальнай умовай павышэння гэтага статусу з'яўляецца кваліфікаваная, эфектыўная, высокапрадукцыйная праца ў розных сферах народнай гаспадаркі, навукі і культуры. Аб гэтым сведчаць даныя сацыялагічных даследаванняў, якія былі праведзены вучонымі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі ў 1998 г. Амаль палова апытаных (больш за 47 %) выказвалі намер павысіць сваю кваліфікацыю, яшчэ 29,9 % — хацелі б набыць другую, больш цікавую і прэстыжную прафесію. Такім чынам, больш трох чацвёртых (амаль 77 %) маладых людзей не былі задаволены дасягнутым у сферы працоўнай дзейнасці і сур'ёзна задумваліся над тым, як набыць больш высокі кваліфікацыйны ўзровень [6].

На важную ролю прафесіі ў дасягненні высокага сацыяльнага статусу ўказваў яшчэ П. Сарокін: «Відавочна, што пэўныя класы прафесій заўсёды складалі верхнія сацыяльныя страты, у той час як іншыя прафесійныя групы амаль заўсёды знаходзіліся ў аснове сацыяльнага конусу» [7].

Прыкладна палова апытаных вучонымі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі юнакоў і дзяўчат (адпаведна 51,9 % і 48,6 %) лічылі важнейшым фактарам паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча павышэнне прафесійна-кваліфікацыйнага ўзроўню. У гэтых адносінах пазіцыі мужчын і жанчын фактычна супадалі і па накіраванасці і па колькасці. Разам з тым адчувалася дыферэнцыяцыя: калі маладыя мужчыны ў значнай частцы (33,3 %, г. зн. кожны трэці), арыентаваны на павышэнне кваліфікацыі ў межах выбранай прафесіі, то ў маладых жанчын такая арыента-

цыя выражана значна слабей (20,4 %, г. зн. кожная пятая рэспандэнтка). Што тычыцца перамены прафесіі, тут большы дынамізм у арыентацыях праяўляюць маладыя жанчыны. Намер набыць больш перспектыўную прафесію сярод іх выказалі 28,2 %, а сярод маладых мужчын — 18,6 % [8].

На аснове комплекснага тэарэтыка-прыкладнога даследавання асаблівасцяў сацыялізацыі студэнцкай моладзі Рэспублікі Беларусь, праведзенага ў апошнія гады, Л. І. Шумская прыйшла да высновы, што назіраецца тэндэнцыя стратыфікацыі моладзі не толькі ад сацыяльнай прыналежнасці і ўласнага сацыяльнага статусу (студэнцтва, рабочая моладзь, прадпрымальнікі), але і ад сістэмы пажаданых ёй каштоўнасцяў і інтарэсаў, якія абумоўліваюць індывідуальны вобраз жыцця. Структура каштоўнасцяў студэнтаў, а таксама патрэб, матываў, інтарэсаў выступае адлюстраваннем усіх тых складаных сацыяльных супярэчнасцяў, якія ўласцівы сучаснаму беларускаму грамадству.

Звяртае на сябе ўвагу факт, што ў якасці важнейшых асобасных прыярытэтаў выступаюць такія пазітыўныя сацыякультурныя арыентацыі студэнцтва, як патрэба ў самарэалізацыі і актыўным самасцвярджэнні ў грамадстве, якаснай адукацыі і сацыяльнай значнасці будучай прафесійнай дзейнасці [9].

У выніку можна адзначыць, што асноўнымі фактарамі павышэння сацыяльнага статусу моладзі Беларусі на сучасным этапе развіцця нашага грамадства з'яўляюцца:

- Паспяховае вырашэнне фундаментальных, ключавых пытанняў эканамічнага, палітычнага і духоўнага развіцця беларускага грамадства.
- Удасканаленне ўсёй сістэмы дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі — як на ўзроўні прынцыпаў, так і на ўзроўні канкрэтнай дзяржаўнай улады. Галоўную сутнасць дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі можна сфармуляваць як стварэнне сістэмы гарантаваных сацыяльна-эканамічных, палітыка-прававых і арганізацыйных умоў для аптымальнага станаўлення маладога чалавека і рэалізацыі творчага патэнцыялу маладога пакалення ў інтарэсах развіцця ўсяго грамадства [10].
- Змяненне адносін грамадства да моладзі. Новы тып адносін грамадства да моладзі разглядае яе не толькі як аб'ект уздзеяння, а перш за ўсе як суб'ект развіцця, не столькі як сродак, колькі, галоўным чынам, як мэту.
- Як мага больш хуткае прывядзенне структуры прафесійна-кваліфікацыйнай падрыхтоўкі моладзі ў максімальна магчымую адпаведнасць са структурай існуючых вакансій рабочых месц і тэндэнцыямі структурнай перабудовы эканомікі.
- Дапамога ў прафесійнай арыентацыі моладзі.
- Павышэнне сацыяльнага прэстыжу ў грамадстве кваліфікаванай прадукцыйнай працы.

- Неабходнасць адраджэння ва ўсіх установах дзяржаўнай і недзяржаўнай маёмасці матывацыі і стымулявання прадукцыйнай працы.
- Садзеянне моладзі ў атрыманні канкурэнтаздольнай ва ўмовах рыначных зносін прафесіі, спецыяльнасці.
- Дзяржаўная падтрымка і садзеянне розным групам моладзі ў працэсе першаснага працаўладкавання.
- У працэсе вучэбнага працэсу, пазакласнай і пазааўдыторнай рабоце выхаванне ў моладзі духу ініцыятывы і творчасці.
- Большы працэнт вылучэння моладзі на адказныя пасады ў органах дзяржаўнай улады, у дыпламатычную сферу, эканоміку, навуку і культуру.

Застаецца спадзявацца, што наступіць час, калі моладзь Беларусі атрымае ўсе магчымасці для рэалізацыі свайго інтэлектуальнага і працоўнага патэнцыялу. Ад таго, наколькі хутка ён прыйдзе, залежыць будучае нашай краіны.

*Літаратура*

1. *Зиновский В. И.* Численность и основные социально-демографические характеристики населения Республики Беларусь по данным переписи населения 1999 года // Социология. 1999. № 4. С. 7.
2. *Рысюкевич Н. Г.* Молодежь на пороге перемен // Между прошлым и будущим: Тез. докл. Междунар. науч. конф. «Современный политический и социально-экономический процесс в Беларуси, России и Украине: состояние, проблемы, перспективы». Мн., 2000. С. 219.
3. *Кохонов Н. Д., Яковчук В. Н.* Направления социальной поддержки молодежи на рынке труда Беларуси // Беларусь: вчера, сегодня, завтра. По материалам социологического мониторинга: Сб. науч. тр. Мн., 2001. С. 122.
4. Социология молодежи / Ю. Г. Волков, В. И. Добреньков, Ф. Д. Кадария и др. Ростов н/Д., 2001. С. 377.
5. *Меренков А. В.* Жизненные ориентиры подростков // Социологические исследования. 1998. № 12.
6. *Бабосов Е.* Молодежь Беларуси на пороге XXI века // Беларуская думка. 1999. № 6. С. 40.
7. *Сорокин П.*Человек. Цивилизация. Общество. М., 1992. С. 353.
8. *Бабосов Е.* Молодежь Беларуси... // Бел. думка. 1999. № 6. С. 36.
9. *Шумская Л. И.* Студенческая социализация молодежи. Мн., 2001. С. 215.
10. *Данилов А.* Молодежь кризисных лет. Иллюзии и новые надежды. Мн., 1999. С. 265—266.

SUMMARY

*This article is devoted to the principal factors of rise of the social status of Belarusian youth at contemporary stage. It is based on the results of the sociological researches among students of Belarusian State Pedagogical University named after M.Tank and Belarusian State University.*

УДК 316.346.32-053.6

*М. Б. Канапацкі*

## ДА ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ СУБКУЛЬТУРЫ

Моладзь як асобая сацыяльна-дэмаграфічная група характарызуецца акрэсленымі культурнымі ўласцівасцямі. Маладзёжная культура дэтэрмінуецца той культурнай сістэмай, да якой яна належыць. Калі культура грамадства знаходзіцца ў крызісе, то і маладзёжная культура адчувае яго ўплыў.

Маладыя людзі ўваходзяць у «дарослае жыццё», адчуваючы на сабе ўсе складанасці існуючага становішча. Пры гэтым моладзь адчувае дваякае ўздзеянне: сваёй асабістай прыроды і волі ў сілу дзеючых знешніх абставін. Як рэакцыя на выпрабаванні, выпаўшыя на яе долю, — імкненне стварыць нейкую «абарончую зону» з маладзёжнымі стандартамі, дзе можна свабодна сябе адчуваць і паводзіць, карыстацца максімумам увагі, ідэнтыфікавацца з аднагодкамі.

Менавіта на гэтай аснове ўзнікае маладзёжная субкультура як сукупнасць акрэсленых уяўленняў аб сабе і навакольным асяроддзі, пачуццяў і стандартаў паводзін. Нямецкі сацыёлаг К. Мангейм казаў аб моладзі як нейкай супольнасці, апантанай канфліктна ў адносінах да дарослых. Эмоцыі — вось што ўмацоўвае моладзь па Мангейму. Маладзёжны рух 60-х гг. пацвердзіў тэарэтычныя захады Мангейма. Маладзёжная культура зацвердзіла сябе праз комплекс ідэй, норм і каштоўнасцяў, прызваны выразіць самасвядомасць пакалення «дзяцей», супрацьлеглых пануючай культуры.

Гэта ўсвядомленае супрацьстаянне было акрэслена паняццем «контркультура». Яго трэба было разумець як новы жыццёвы стыль, новую сістэму норм і каштоўнасцяў.

Вылучаючы элементы «маладзёжнай культуры», заходнія даследчыкі акрэслілі паняцце субкультуры. Маладзёжная субкультура з'яўляецца адной з характарыстык ладу жыцця моладзі.